# “НА ТАЛЕНТЫ БАГАТАЯ ЗЯМЛЯ…”

## Паэтычны калейдаскоп беларускіх паэтаў-землякоў

*Афармлены стэнд з фотаздымкамі розных старонак жыцця А.А.Куляшова, А.С.Русецкага, А.У.Пісьмянкова*

*Гучыць фонавая музыка, выходзяць вядучыя:*

**Вядучы 1.** Добры дзень, паважаныя сябры- крынічане і госці нашай сустрэчы!
**Вядучы 2.**Сённяшняе пасяджэнне Народнага аматарскага аб'яднання “Літаратурная гасцёўня “Крынічка” пад назвай “На таленты багатая зямля” прысвечана нашым паэтам землякам- Аркадзь Аляксандравічу Куляшову, Аляксею Сцяпанавічу Русецкаму, а таксама Алесю Уладзіміравічу Пісьмянкову.

________________ Як дзень адыходзіць, прыходзіць нябыт
Начных заспакоеных сноў,
Ізноў я выходжу глядзець на блакіт,
На зоры далёкія зноў.

Як нам таямнічы іх шлях разгадаць?
Яны за арбітай зямлі
Праз дальнія далі, праз сінюю гладзь
Плывуць, як плывуць караблі.

Плывуць, і шляхоў іх праменная ніць
Загадкава мару кране:
І там у каго-небудзь сэрца гарыць,
Як сэрдца гарыць у мяне!

Магчыма, і ён за пачаткамі схем
Сядзіць і не лічыць гадзін
Над беззлічу гэткіх, як мы, тэарэм,
Над планам складаных машын.

Прымі прывітанне, бясконцы сусвет
Далёкіх Цэнтаўраў і Львоў,
Далёкі таварыш, далёкі паэт
З няходжаных Млечных Шляхоў.

А я на зямлі- малады астраном-
З нязнаным размовы вяду,
Наш вецер трывожыць траву за акном,
Наш вечар трывожыць ваду.

Далёкі таварыш і казак і сноў
І песень абсуджаных госць,

У жылах тваіх неспакойная кроў,
Няўрымслівая маладосць!

Мы творчаю прагай разбурым мяжу,
Працуй над складанасцю схем,
І я калі- небудзь табе раскажу
Урыўкі пачатых паэм.

Тады мы ў прасторы абжытых планет-
Да іх жыхароў і жылля-
Ад нашых хацін адашлём свой прывет:
"Увага!..
Гаворыць…
Зямля!..."

(А.Куляшоў, 1930)

**Вядучы 1**. Паэзія А. Куляшова – гэта ўсхваляваны маналог пра людзей, якія ва ўпартым змаганні з варожымі абставінамі застаюцца непераможнымі духоўна. Нягледзячы на сваю маладосць, ён заўсёды заставаўся цвердым у сваіх поглядах на літаратуру. Ен ведаў, што фармальнае штукатурства збяднае літаратуру, што творчасць Купалы і Коласа з'яўляецца вялікай школай для маладога пісьменніка.

**Вядучы 2.** Народны паэт Беларусі Аркадзь Куляшоў нарадзіўся 6 лютага 1914 г. у мястэчку Саматэвічы Касцюковіцкага раена Магілеўскай вобласці. Яго бацькі былі настаўнікамі, але ўвесь уклад сямейнага жыцця быў блізкі да сялянскага. У 1970 г. у паэме « Далека да акіяна » А. Куляшоў пісаў пра родную хату, у якой прайшло маленства:

**Вядучы 1.** Токам і адрынаю,
Правай палавінаю,
Кухняю гаротнаю,
Скрухай калаўротнаю
На краю сяла, --
Чым ты толькі, родная
Хата, не была?

**Вядучы 1.** У сталыя гады А. Куляшоў з удзячнасцю ўспамінаў родную хату, якая ў Саматэвічах стала своеасаблівым клубам – культурным цэнтрам мястэчка.

Дзіцячыя гады А. Куляшова прайшлі ў час рэвалюцыйнага абнаўлення жыцця. Новыя, калектывісцкія адносіны складваліся паміж людзьмі. Маладое пакаленне расло ў атмасферы дружбы і таварыскасці, яно не ведала страху перад заўтрашнім днем. Усе гэта спрыяла актывізацыі творчых сіл асобы.

**Вядучы 2**. Паэтычны талент А. Куляшова абудзіўся рана. Пісаць вершы ен пачаў з сямі гадоў, а ў 1926 г. Клімавіцкая раенная газета « Наш працаўнік »

надрукавала яго верш « Ты мой брат ». Аўтару было ў гэты час дванаццаць гадоў.

**Вядучы 1.** У пачатку 30-х гг. выйшлі першыя зборнікі вершаў А. Куляшова – «Па песню, па сонца » і «Медзі дождж » ( 1933). Яны прасякнуты пачуццем радаснага самасцвярджэння асобы ў грамадстве. Разам з тым увагу Аркадзя Куляшова прыцягваюць і трагічныя падзеі нядаўняга мінулага. Пра лёс інвалідаў першай сусветнай вайны А. Куляшоў расказаў у паэме « Крыўда».

**Вядучы 2.** У пасляваенны час А. Куляшоў таксама напісаў шмат твораў пра выдатных сыноў нашага народа. Найбольш значнымі ў гэты час кнігамі былі зборнікі вершаў «Камуністы », « Новая кніга », « Сасна і бяроза », а таксама паэмы « Цунамі », « Далека да акіяна », « Варшаўскі шлях ». Цыкл вершаў «Маналог», прысвечаны памяці Змітрака Астапенкі і Юлія Таўбіна, беспадстаўна абвінавачаных у гады культу асобы Сталіна. Пра выдатнага кіраўніка нацыянальна – вызваленчага руху ў 1863 г. Кастуся Каліноўскага А. Куляшоў расказаў у драматычнай паэме « Хамуціус» (1975). Назва твора паходзіць ад падпольнай мянушкі, якую ўзяў сабе К. Каліноўскі, падкрэсліўшы тым самым сваю блізкасць да сялян, якіх паны называлі хамамі.

**Вядучы 1**. Раптоўная смерць абарвала 4 лютага 1978 г. паэтычны маналог мужнага паэта – мысліцеля і грамадзяніна, але ў яго творах назаўседы засталіся жыць вобразы лепшых сыноў нашага народа – жывая памяць пра гераічнае мінулае. У творах навечна застаўся з намі і вобраз паэта, які ўзбагаціў беларускае мастацкае слова новым сэнсам – паглыбленым разуменнем сутнасці эпохі. Пра гэта вельмі добра сказаў Янка Брыль: « Да болю часам шаблонная фраза: « У асобе яго мы страцілі… ». Не, у асобе Аркадзя Куляшова мы – у самым шырокім, трывалым гучанні гэтага мы – набылі, маем паэта, значэнне якога надзейна мацуе вечнасць нашага слова ».

_________ Ад шчасця сэрца скача, як дзіця,
Ад бед яно, як млын, шуміць начамі,
Варочае цяжкімі камянямі,
Падлічваючы горычы жыцця.

Ды сэрцу быць гадзіннікам не гожа:
Спынілася - і ўжо не завяду,
Яно секунды адбіваць не зможа,
Калі падкосіць смерць маю хаду.

Яго ў рамонт, як здарыцца патрэба,
Я не аддам дасведчаным майстрам
І, як стары гадзіннік, не прадам
У дні нястач і бед за лусту хлеба.

Затое з ім далей у свой паход
Я крок у крок датуль ісці гатовы,
Пакуль не скончыцца яго жыццёвы,
На ўвесь мой шлях разлічаны, завод.
(А. Куляшоў «Ад шчасця сэрца скача, як дзіця...»1962)

**Вядучы 2.** Паэзія Аляксея Сцяпанавіча Русецкага адметная і, як ва ўсякага сапраўднага творцы,- глыбока індывідуальная, метафарычная,у чымсці патаемная, але у той жа час зразумелая чытачам розных пакаленняў і роду заняткаў.

**Вядучы 1.** Нарадзіўся ён ў вёсцы Студзянец Касцюковіцкага раёна ў сялянскай сям'і. Закончыў пачатковую школу, Касцюковіцкую сямігодку і Аршанскі педтэхнікум. У 1931 г. паступіў у Маскоўскі зоаветэрынарны інстытут. Пасля заканчэння з дыпломам ветурача камандзіраваны ва Узбекістан. У тым жа годзе прызваны ў Чырвоную Армію. Пасля дэмабілізацыі працаваў у маскоўскім мікрабіялагічным інстытуце. У студзені 1938 г. пераехаў у Мінск, працаваў загадчыкам бактэрыялагічнага аддзела абласной ветэрынарнай лабараторыі. Са студзеня 1942 г. на фронце. Служыў начальнікам палявой лабараторыі на Калінінскім, Заходнім, 3-м Прыбалтыйскім франтах. У Мінск вярнуўся ў 1947 г. Да 1951 г. працаваў літкансультантам па паэзіі ў СП Беларусі, у 1951 г. загадваў аддзелам публіцыстыкі.

**Вядучы 2.** Вершы А.Русецкага кранаюць менавіта сваім моўным гучаннем, сутнацю размовы с самім сабою і з чытачом.Зараз вы пачуеце верш, які Аляксей Сцяпанавіч прысвяціў свайму земляку, калеге па пяру, амаль што равесніку Аркадзю Куляшову…А нам, Касцюкоўчанам, удвая прыемна, бо мы чуем у ім прызнанне ў любові роднаму краю…

____________ Ён пашаннай не шукаў сабе пасады,
Не прыкідваў, хто ніжэй, а хто вышэй;
Незабыўны, з думкай смелаю крылатай
І з лагоднаю смяшынкаю вачэй.

Ён захопленны быў светам шматгалосым,
Чулым сэрдцам востра бачыў, быстра жыў,
Адкрываў для ўсіх паэзіі нябёсы,
Хараство яе абшараў, новых ніў.

Ля ракі яго маленства, першай мары,
Дарагі яму зязюльчын ёсць куток,
Побач станцыя малая "Камунары",
Паравозны ўдалеч поклічны гудок.

І ў наступным часе, кожнаю вясною,
Як пад сонцам абуджаецца трава,

Будзе сонца біцца гулкае лясное,
Будзе з песні той зязюля кукаваць…

**Вядучы 1.** Тэматыка і і праблематыка творчасці А.Русецкага выходзіць далека за межы штодзённага, побытовага… Голас яго творчай душы імкнуўся ўвышынь, інтэлект прагнуў зазірнуць у невядомую будучыню, сэрца хацела спяваць….

**Вядучы 2.** Паэта моцна хвалявалі глабальныя праблемы: лёс планеты, яе экалагічны і эканамічны стан, адносіны паміж людзьмі і ўсведамленне імі адказнасці за наступныя пакаленні…

**Вядучы 1.** …Жыві, Беларусь, – жыві
на радасць і нам і ўнукам!
Ты ў нашай душы, крыві,
мы волі твае зарука!

**Вядучы 2.** У шматлікіх творах А.Русецкі выявіў сябе тонкім лірыкам. Маляўнічае апісанне прыгажосці роднай зямлі, сцвярджэнне найвышэйшых эстэтычных пачуццяў, у першую чаргу, кахання, у паэзіі Русецкага ствараюць незвычайны, метафарычны, чуйны сінтэз усяго каштоўнага, што ёсць у чалавечай душы, што дае выключную магчымасць паўнавартасна крыстацца найвялікшым дарам - жыццём.

**Вядучы 1.** "Час ідзе сваім ходам, а гэты Час-вельмі строгі суддзя, бо ён не зважае, як кажуць, на аўтарытэты. Ен цэніць толькі сапраўдныя таленты…" Так адбылося і з паэзіяй яркай зоркі на літаратурным небасхіле Беларусі песняра Касюковіцкага краю Алеся (Аляксандра) Уладзіміравіча Пісьмянкова. Паэзіяй, якая не можа не выклікаць захаплення, і якая не пакіне абыякавым ні воднага аматара гэтага самага прыгожага віда пісьменства.

**Вядучы 1.** Пакуль дыхаю родным дымам,
Мне пад небам маім нязмрочна,
Як за пазухай у радзімы,
Як народжанаму ў сарочцы.

**Вядучы 2.** Паэта нарадзіла і ўзрасціла багатая талентамі зямля Прыбяседдзя. Ён нарадзіўся ў вёсцы Іванаўка 25 лютага 1957 года, там жа зрабіў першыя свае крокі і там жа, яшчэ ў школьныя гады, нарадзіліся яго першыя вершы, якія друкаваліся ў Касцюковіцкай раённай газеце. Пасля заканчэння школы здольнага юнака запрасілі на працу ў раённую газету "Сцяг камунізму" (1974- 1975 гг).

**Вядучы 1.** Алесь Пісьмянкоў закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У.І. Леніна (1980). Атрымаўшы дыплом аб вышэйшай адукацыі, працаваў у аддзеле крытыкі і бібліяграфіі штодыднёвіка "Літаратура і мастацтва", перайшоў у часопіс "Полымя" рэдактарам аддзела навукі і мастацтва,

выбіраўся сакратарам Саюза пісьменнікаў Беларусі, а потым вярнуўся ў ”Полымя” намеснікам галоўнага рэдактара, каб пазней зноў перайсці ў “ЛІМ”, цяпер ужо галоўным рэдактарам. Апошнім часам узначальваў рэдакцыю гумарыстычна- сатырычнага часопіса “Вожык”.

**Вядучы 2.** Першы верш надрукаваў у 1972 у касцюковіцкай раённай газеце «Сцяг камунізму». Дзесяцікласнікам паслаў падборку вершаў у «Магілёўскую праўду». У абласным і рэспубліканскім друку А. Пісьмянкоў выступае з 1974. Яго вершам характэрна рамантычная ўзнёсласць, імкненне лірычнага гэроя да дабрыні, добразычлівае стаўленне да чалавека. Адначасова паэт поўны непрымірымасці да чэрствасці, абыякавасці, душэўнай глухаты. У яго вершах пачатковага этапа грамадзянскі пафас быў прыглушаны; потым паэт стаў глыбей асэнсоўваць гістарычны шлях Бацькаўшчыны, творы набылі філасофскую заглыбленасць, эпічную непаспешлівасць і грунтоўнасць (зборнікі «Белы камень» і «Чытаю зоры»).

**Вядучы 1**. Ізноў прыйшоў я на ускраек бору —
Я тут не быў пасля зімовых сцюж.
З прыемнасцю ўдыхаю пах чабору —
Ён мне мілей, чым водар пышных руж.
Як тут хадзіў у зімнюю часіну.
То я такі усцешаны не быў:
Бор выглядаў сумлівай сірацінай,
Бо тут чабор так весела не цвіў.
Вось так і я: задумлівы, у скрусе
Бываю незвычайнаю парой,
Калі жыву ўдалі ад Беларусі —
Далёка ад азёраў і бароў.
І варта зноў мне ў Беларусь прыехаць,
Акінуць вокам свой лясны прастор, —
Душу напоўняць радасць і уцеха,
І ўсмешка зацвітае, як чабор.

**Вядучы 2**.Радзіма асацыіруецца ў свядомасці і вершах паэта з родным бацькоўскім домам, куды зноў і зноў цягнула яго памяць.

А як жа добра ў яго атрымліваецца - кропелька суму, плюс кропелька гумару, плюс кропелька філасофскага матыву…і чамусьці адразу хочацца дамоў.

_________ Я разумею, разумею
І я душой збалеў па тым:
Цябе цаніць мы не умеем-
У горад птушкамі ляцім.

Далей ад бацькаўскага дома,
У кола дробненькіх патрэб…
А хлеб расце не ў гастраноме,
Не на асфальце спее хлеб!

З гнязда узляцім- і ходу,ходу
Шукаць у горад сваякоў.
К табе мы ездім на прыроду,
Па  сала ездім да бацькоў.

А потым пішам і гаворым,
Клянемся маці і зямлі…
А мне за рукі свае сорам-
Твае баляць мне мазалі.

**Вядучы 1.** А. Пісьмянкоў  у параўнанні з іншымі вялікімі паэтамі і пісьменнікамі Беларусі напісаў не вельмі многа, затое ў яго няма няшчырых, або няўдалых вершаў. Усе яны- як манеты залатой чаканкі. У іх прастате- уся прыгажлсць і дакладнасць слова.

**Вядучы 2.** Тыя, хто ведаў паэта, не раз заўважалі, што паміж напісаным ім і яго асобай існавала дзівосная гармонія: ён быў вельмі светлай, цэльнай натурай, яго паважалі і любілі…Думаецца, што і творчасць Алеся Пісьмянкова нельга не любіць, нельга не чытаць, нельга не спяваць.

***Гучыць песня на словы А.Пісьменкова "Лазня"***

**Вядучы 1.** Колькі ж у яго творах святла, чысціні, пачуцця! Чым жа выклікана такая папулярнасць паэта?

**Вядучы 2.** Відавочна, прычына такой папулярнасці ў станаўленні Алеся Пісьмянкова да Слова як да святая святых, дадзенага чалавеку для таго, каб зберагчы ў душы ўсё  ўзвышаннае, светлае…" …І раптам слова-  ажыве, мяне ўратуе тое слова!"

_____________ Трывожна-сцішаны Сусвет.
Агеньчык свеціцца да рання.
Планету слухае паэт,
Яе гарачае дыханне.

Над ім плыве галактык спеў,
Як доктар, слухае ён вечнасць,
Каб перакласці мову дрэў
На голас чалавечы.

Каб не сфальшывіць, не зманіць,
Душу халодную расчуліць,
У ім заплача сто крыніц,
У ім зазвоніць сто рачулак.

…Сяброў палеглых пазаве
З франтоў пякельных і суровых,
І раптам слова- ажыве,
Мяне ўратуе тое слова.